# МЕТАДЫЧНАЯ СПАДЧЫНА К. МІЦКЕВІЧА (Я. КОЛАСА)

*М.І. Сянкевіч*

Многія цікавыя метадычныя знаходкі папярэдніх стагоддзяў так і засталіся незапатрабаванымі школай па той прычыне, што ў свой час не было адпаведных умоў для іх рэалізацыі на практыцы. Гэта мае дачыненне і да метадычнай спадчыны Якуба Коласа.

Паспрабуем з пазіцый сучаснай педагагічнай навукі даць ацэнку поглядам пісьменніка на асобныя пытанні выкладання роднай мовы ў пачатковых классах.

Кожны творца па-сапраўднаму цікавы сваёй першай кнігай. Такой кнігай, як вядома, для Якуба Коласа было складзенае, а калі быць дакладным, напісанае ім «Другое чытанне для дзяцей беларусаў». Гэтую кнігу малады пісьменнік ствараў з асаблівай любоўю, з пачуццём адказнасці перад будучымі чытачамі. Не мог не пісаць, бо, педагог па адукацыі, адчуваў яўныя хібы і «Першага чытання для дзяцей беларусаў» Цёткі, і недахопы «Беларускага лемантара» (па адным з меркаванняў) Каруся Каганца – кніжак, што меліся на той час.

Складзенае пад уплывам «Роднага слова» К. Ушынскага і «Азбукі» Л. Талстога Коласава «Другое чытанне…» мае  шэраг сваіх адметнасцей. Бясспрэчна, тэматыка твораў у падручніку К. Ушынскага значна шырэйшая, у той жа час у  яго «Азбуцы» не праследжваецца настолькі глыбока сувязь з сацыяльнымі праблемамі жыцця, як у Коласа. Колас-педагог, шчыры прыхільнік метадычнай думкі К. Ушынскага, не пагаджаецца са сваім знакамітым папярэднікам, які лічыць, што дзецям не абавязкова бачыць свет ва ўсёй яго неўладкаванасці і непрывабнасці. На думку Я. Коласа, вучні павінны пазнаваць жыццё такім, якое яно ёсць. У гэтых адносінах Я.Колас блізкі да В. Бялінскага, які заклікаў дзіцячых пісьменнікаў паказваць рэчаіснасць  ва ўсёй яе чароўнасці і ў той жа час суровасці. Працуючы з вершамі і апавяданнямі «Другога чытання…» на ўроку, настаўнік беларускай школы меў магчымасць абуджаць крытычную думку дзяцей, жаданне змяніць жыццё да лепшага.

Неабходна заўважыць, што дзеці сённяшніх беларусаў знаёмяцца – па «Роднаму слову» і іншых чытанках для пачатковай школы – амаль з двума дзесяткамі вершаў, апавяданняў і казак, якія ўпершыню прачыталі іх далёкія продкі яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя ў  «Другім чытанні для дзяцей беларусаў». А гэта значыць, што жыццё Коласавай кнігі працягваецца.

Колас-педагог неаднойчы засяроджваў увагу настаўнікаў і метадыстаў на якасці мастацкіх твораў, змешчаных у кнігах для чытання. Матэрыял, на думку пісьменніка, павінен быць бездакорным у эстэтычным сэнсе, а таксама літаратурна-правільным у адносінах мовы. Пісьменнік выступаў супраць «выхаваўчага чытання», прыхільнікі якога не лічылі абавязковым уводзіць у падручнікі творы вядомых аўтараў.

Погляды Я. Коласа на праблемы навучання беларускай мове найбольш паслядоўна выкладзены ім у «Методыцы роднае мовы». Па словах самога пісьменніка, яго «Методыка…» не прэтэндуе на арыгінальнасць і носіць кампілятыўны характар. Думаецца, аднак, што за гэтымі словамі прагледжваецца сціпласць аўтара: далёка не ўсе палажэнні падручніка можна разглядаць як абагульненне існуючых падыходаў да навучання мове ці як вопыт працы тагачаснай школы.

Настаўнік пачатковых класаў, зазначае пісьменнік-педагог, – павінен перш за ўсё навучыць дзяцей самастойнаму чытанню. Тлумачальнае чытанне не спрыяе развіццю навыкаў самастойнай працы з кнігай. Гэтым метадам Якуб  Колас раіць карыстацца толькі працуючы з дзелавымі артыкуламі, бо пры чытанні мастацкіх твораў праца ўяўлення і пачуццяў важней, чым праца думкі і памяці.

Да цяперашняга часу настаўнікі пачатковых класаў сустракаюцца з вялікімі цяжкасцямі, пераключаючы дзяцей ад вуснага маўлення да пісьмовай мовы, бо пісьмовая мова, гэта не проста сума двух складнікаў – умення гаварыць і тэхнікі пісьма. Вусная мова сітуацыйная, актыўная, экспрэсіўная, дыялагічная, матываваная… Адрозненні вуснай і пісьмовай мовы грунтоўна даследаваны ў працах Л. Выгоцкага, Л. Занкова, Ш. Аманашвілі… Але ўжо тады, у сярэдзіне дваццатых гадоў, – і «Методыка роднай мовы» таму сведчанне – Колас выразна акрэсліў сваё бачанне праблемы: вусная мова, хоць і рыхтуе вучняў да ўспрымання і карыстання пісьмовай, будуецца па ўласных законах. Вось толькі некаторы з задач, якія ставіць Колас-педагог перад настаўнікам у галіне развіцця вуснай мовы:

– асэнсавана і крытычна ўспрымаць вусную мову на слых;

– вылучаць у выказванні сэнсавыя блокі;

– сачыць за структурай разгортвання вуснага тэксту;

– уступаць у суразмоўніцтва…

Як справядліва заўважыў вядомы айчынны вучоны-метадыст М. Г. Яленскі, у вырашэнні гэтых і некаторых іншых задач «сучасная школа знаходзіцца яшчэ далёка ад практычнай рэалізацыі ідэй Я. Коласа [2; с. 8 ]. А што да навучання актыўнаму слуханню як аднаму з відаў моўнай дзейнасці, то ў гэтых адносінах робяцца толькі першыя крокі.

У якасці асноўнага падыходу да навучання Я. Колас бачыць наступны: не столькі даць вучням веды пра мову, колькі прызвычаіць іх да моўнай дзейнасці. На думку пісьменніка, канчатковая мэта навучання – "умелае карыстанне роднай мовай для выказвання ўласных думак [1; с. 315 – 316]. Гэтую цытату можна ўзяць эпіграфам да новых падручнікаў па методыцы беларускай мовы. Цяперашнія "камунікатыўны падыход", "функцыянальны падыход" – сутнасць не ў тэрмінах – не што іншае, як спроба рэалізаваць ідэі, закладзеныя ў першай айчыннай методыцы Я. Коласа.

Вялікае значэнне надае Я. Колас развіццю творчага мыслення малодшых школьнікаў праз уключэнне іх у самастойную пазнавальную дзейнасць. Агульнае развіццё асобы ён звязвае з актыўным авалоданнем роднай мовай як інструментам мыслення. Гэта не што іншае, як дзейнасны

падыход да авалодання роднай мовай, пра які так многа гаворыцца ў апошні час.

Задачу настаўніка Колас бачыць і ў тым, каб далучыць вучня да самога працэсу творчасці. У адрыве ад творчых прац, лічыць пісьменнік, навучанне роднай мове цяжкае і нецікавае: мастацкую сутнасць літаратурнага твора дзіця зразумее, асэнсуе, толькі ўключыўшыся ў актыўную творчую дзейнасць.

Адзін з найбольш моцных бакоў Коласавай “Методыкі...” – выразная, асэнсаваная на практыцы сістэма пісь мовых прац. У пераліку такіх прац пісьменнік дае лісты, апавяданні, вершы, нарысы, крытычныя замалёўкі, загадкі, аб’явы, тэлеграмы, заявы. Ужо на чацвёртым годзе навучання, пераконвае Я. Колас, неабходна ўвесці пісьмовыя стылістычныя працы незалежна ад вусных, абмежаваўшы падрыхтоўку да іх агульнакласным абмеркаваннем плана, а ў старэйшых класах вучні павінны ўмець пісаць даведкі, пратаколы, акты, біяграфіі, канспекты, тэзісы, анатацыі, рэцэнзіі...

Думаецца, даўно наспеў час перавыдаць “Методыку роднае мовы” К. Міцкевіча (Я.Коласа) асобнай кнігай, забяспечыўшы яе адпаведнай грунтоўнай прадмовай, бо далёка не кожны настаўнік пачатковай школы мае магчымасць карыстацца 14-томным выданнем Збору твораў пісьменніка. Метадычныя ідэі Я. Коласа маюць вялікае значэнне не толькі для гісторыі педагагічнай думкі, але і для практычнай работы сучаснай школы.

Літаратура

1. Колас Якуб. Збор твораў: У 14-ці т. – Мінск, 1976, т. 12.
2. Яленскі М. Г., Антонава Н. У. Сучаснае прачытанне “Методыкі роднае мовы” К. Міцкевіча (Я. Коласа) // Пачатковая школа. – 2002. – № 7.